Валеры
БОЛБАС

# Златавуст

Складанасці духоўнага ўладкавання грамадства вымушаюць, апроч усяго іншага, шукаць выйсце ў паралелях мінуўшчыны, і нават вельмі сівой мінуўшчыны.

Гісторыя сведчыць, што пры ўсіх заблытанасцях і зменлівасцях у іерархіі чалавечых каштоўнасцей розных эпох нашы прашчуры заўсёды бясспрэчны прыярыэт аддавалі маральна-духоўным. Жыццё, дзейнасць і ідэі айчыннага Златавуста — усходнеславянскага пісьменніка, прапаведніка Кірылы Тураўскага — яскравае таму сведчанне. Меў рацыю досыць стрыманы на хвалебныя эпітэты даследчык старажытнарускай літаратуры У. Колесаў, які сцвярджаў: "Пожалуй до Державина в русской литературе не появлялся писатель такой силы, значительности и высоты нравственного чувства, как Кирилл — совесть своего нелёгкого и бурного времени".

Да нашых часоў, акрамя асобных твораў тураўскага епіскапа, захавалася не шмат фактаграфічных крыніц, якія б дастаткова поўна асвятлілі жыццёвы шлях і веліч спраў славутага земляка. Але багацейшая літаратурная спадчына, якая дайшла да нас праз такі значны прамежак часу, лішні раз пераконвае, што славянскія землі падаравалі свету сапраўднага валадара пісьмовага і вуснага слова, які ўнёс неацэнны ўклад у развіццё духоўнай культуры.

Многія даследчыкі на аснове ўскосных звестак прыходзяць да высновы, што нарадзіўся будучы асветнік каля 1110 года ў старажытным беларускім горадзе Тураве, адным з першых цэнтраў кнігапісання ўсходніх славян, сталіцы Турава-Пінскага княства. Аўтар пролагавага Жыція св. Кірыла, напісанага яшчэ ў канцы XII ст., занатаваў: "Гэты блажэнны Кірыл быў нараджэннем і выхаваннем з горада Турава, што ў рускім краі, багатых бацькоў сынам". Але не тленныя скарбы вабілі будучага асветніка. Адукаванасць, высакарод-

насць душы ён ставіў непараўнальна вышэй чым бляск золата і срэбра.

Яшчэ ў дзіцячыя гады Кірыла атрымлівае надзвычай грунтоўную адукацыю грэчаскага накірунку, верагодней за ўсё з дапамогай хатняга настаўніка. Глыбокае веданне шматлікай духоўнай літаратуры, якая была тады прадстаўлена ў асноўным кнігамі з Візантыі, не перакладзенымі на тагачасную старажытнаславянскую мову, сведчыць аб дасканалым авалоданні юнаком грэчаскай мовы. У той жа час ён спасціг асновы візантыйскага красамоўства, якое ў далейшым развіў да такой ступені, што на Русі яго сучаснікі і нашчадкі з павагай называлі "Златасловам" або "Златавустам" прыраўноўваючы тым самым айчыннага кніжніка з самым аўтарытэтным і папулярным прадстаўніком усходняй патрыстыкі Іаанам Златавустам (347 — 407 гг.), чые творы лічыліся ўзорам славянскага красамоўства. Імклівае распаўсюджванне хрысціянства (па розных даных толькі ў Тураве ў той час налічвалася ад 40 да 80 цэркваў і манастыроў), а менавіта яно ў асноўным і несла з сабой кніжныя веды, не магло не прыцягнуць да сябе ўвагі таленавітага юнака. Ён становіцца паслушнікам аднаго з манастыроў, дзе, верагодна, працягваў сваю адукацыю і самаадукацыю.

Сёння цяжка дакладна ўстанавіць, дзе настолькі дасканала змог малады тураўлянін авалодаць багаццем кніжных ведаў. Мяркуючы па яго творчасці, без сумневу можна сцвярджаць, што ён у поўным аб'ёме атрымаў адукацыю па многіх навуках з "сямі вызваленых мастацтваў". У прыватнасці, відавочна яго высокая падрыхтаванасць у граматыцы, дыялектыцы, багаслоўі: Кірыла, акрамя рускай, добра валодаў грэчаскай мовай і быў глыбока дасведчаны не толькі ўва ўсіх палажэннях Старога і Новага Запаветаў, але і ў шматлікіх іх тлумачэннях, што давала яму магчымасць і самому рабіць важкім багаслоўскія каментарыі.

Спачатку з мэтай спасціжэння кніжнай мудрасці ў раннім узросце ідзе "богату родителю сын" у манастыр, дзе потым вырашае прысвяціць усё сваё жыццё высакароднай мэце — дапамагчы людзям узразумець сэнс іх жыцця і садзейнічаць маральна-духоўнаму ўдасканаленню грамадства, што і зрабіла яго потым "учительным" іераманахам і духоўнікам міран.

Малады інак спантанна ўзяўся за вывучэнне апакрыфічнай, устаўной, агіяграфічнай і святаайцовай літаратуры. Стаўшы іераманахам, будучы свяціцель вырашае яшчэ больш паглыбіцца ў асэнсаванне асноў духоўнага быцця. Ён адгароджваецца ад мірскіх спраў, зачыняецца ў стаўпе (слупападобнай келлі), дзе грунтоўна вывучае біблейскія кнігі і багаслоўскія трактаты. Там ён піша ўласныя творы, у якіх шляхам тлумачэння Свяшчэннага Пісання спрабуе дапамагчы простым людзям уразумець яго сэнс. Аб гэтым даволі яскрава апавядае аўтар кароткага пролагавага Жыція блажэннага свяціцеля: "По сем блаженный, на болшая подвигы желая, в столп вшед, затворися и ту пребысть неколико время, постом и молитвами паче себе тружаяся. И много божественаа писаниа изволи, славен бысть по всей стране той". Стоўпніцтва — адна з найбольш суровых формаў аскетычнага жыцця, якая дапамагае чалавеку перамагчы свае слабасці. Лічылася, што як нішто іншае яно ўтаймоўвае плоць і ўдасканальвае дух, гартуе і ачышчае падзвіжніка. Дарэчы, Кірыла Тураўскі — адзін з самых першых з усходнеславянскіх манахаў, які здзейсніў такі духоўны подзвіг.

Затворніцтва Кірылы павінна было стаць удзелам усяго яго жыцця, бо адпаведныя правілы VI Усяленскага Сабору забаранялі таму, хто абраў гэты шлях, пакідаць стоўпніцтва. Але лёс распарадзіўся інакш. Багавернае, дабрачыннае жыццё Кірылы, яго высокая адукаванасць і вытанчаны розум былі патрэбны і ў тагачаснай арганізацыі грамадскага ўладкавання.

Князь Юрый Яраславіч, які дамагаўся самастойнасці Тураўскай зямлі, ведаў аб вышэйзгаданых якасцях Кірылы і яго адданасці роднаму краю, таму, абапіраючыся на павагу гараджан да будучага свяціцеля, запрасіў апошняга заняць епіскапскую кафедру. Агіёграф аб згаданым факце сведчыць наступным чынам: "И молением князя и людий того града от митрополита поставлен бысть епископом граду Тураву". Дарэчы, упамянёныя вышэй правілы VI Усяленскага Сабору ў якасці выключэння дазвалялі пакідаць затвор "когда сего потребует общественное служение".

Больш трынаццаці гадоў быў Кірыла Тураўскі ў епіскапскім сане. Гэты перыяд быў самым плённым у жыцці асветніка, менавіта ён прынёс святару вядомасць і славу. Надзвычай высокая адукаванасць, мастацкая фенаменальнасць авалодання словам, якая спарадзіла небывалы дагэтуль узровень красамоўства ў пісьменстве і прамоўніцтве, а таксама ўзорна-праведнае жыццё вымусілі гаварыць аб мніху-кніжніку, як аб вялікім асветніку, які "паче всех воссиял на Руси".

Паралельна з набыццём палітычнай незалежнасці Тураўскім княствам, епіскапская кафедра пры Кірыле атрымала значную самастойнасць, перастала быць вікарыяцкай. У гэты час архірэй-прапаведнік піша лепшыя свае творы. А. Мельнікаў на аснове грунтоўнага аналізу фактаграфічных звестак і саміх твораў Тураўляніна-Златаслова выдзяляе пяць асноўных напрамкаў дзейнасці Кірылы Тураўскага за час епіскапства: уладкаванне епархіі, прапаведніцкі, царкоўна-літаратурны, павучальны і царкоўна-асветніцкі, палітычны і царкоўна-палітычны.

Слушнымі ўяўляюцца меркаванні даследчыкаў-медыявістаў аб адкрыцці асветнікам пры адной з цэркваў у Тураве школы. Таксама верагодна, што, дзякуючы намаганням свяціцеля, быў пабудаваны ў горадзе велічны храм, падмурак якога знойдзены археолагамі ў 1963 годзе. Актыўны ўдзел прымаў епіскап і ў вырашэнні важнейшых праблем Кіеўскай мітраполіі, пад юрысдыкцыяй якой знаходзілася Тураўская епархія. Ну і, вядома ж, асноўныя намаганні асветніка былі скіраваны на пастырскую дзейнасць. З дапамогай пісьмовых

твораў і вусных пропаведзяў ён “найсвятлейшым вучэннем сваім асвятліў землі Рускія”.

Дакладна невядома, да якога часу знаходзіўся епіскап на Тураўскай кафедры. Захаваліся звесткі аб тым, што ў 1184 г. на гэтым месцы ўжо быў св. Лаўрэнцій. На аснове ўскосных звестак многія даследчыкі сыходзяцца на думцы, што памёр Златавуст зямлі стараславянскай на пачатку 1190-х гадоў.

Да нашага часу захавалася звыш шасцідзесяці твораў, аўтарства Кірылы якіх устаноўлена даволі дакладна. Захаванасць такой колькасці прац праз восем стагоддзяў сведчыць аб іх важнасці для нашчадкаў. Пэўна, напісана было яшчэ больш, што разам з першым пераконвае ў геніяльнасці слаўнага сына нашага народа.

З надзвычай багатай спадчыны Кірылы Тураўскага хацелася б засяродзіць увагу на духоўна-асветнай, бо, як уяўляецца, менавіта яна ляжала ў аснове творчых пошукаў і практычнай дзейнасці мысліцеля. Само хрысціянства ў час з'яўлення і распаўсюджвання на землях бацькаўшчыны ў якасці асноўнай мела функцыю вучыцельскую з апорай і арыентацыяй на духоўны бок быцця і, як слушна адзначаюць даследчыкі, з'яўлялася маральна-рэлігійнай школай чалавецтва. Прычым падмуркам удасканалення духоўнага свету кожнай асобы і грамадства наогул бачылася развіццё пісьменнасці, асветы. Услаўляючы кніжныя веды, Кірыла Тураўскі пісаў: “Сладько медвеный сът и добро сахар, обоего же добрее книжный разум: сия убо суть скровища вечныя жизни”. У той далёкі час Тураўскага-настаўніка хвалявала тое, што пісьменнасць, асвета станавіліся прывілеяй толькі асобных саслоўяў. Ён празорліва прадбачыў, што на шляху грамадскага ўладкавання веды аднолькава патрэбны ўсім без выключэння людзям. Звяртаючыся да просталюдзінаў, якія лічылі, што асвета прызначана не для іх, Кірыла Тураўскі ўзрушана дакараў: “Не глаголите: жену имам и дети кормлю, и дом строю ли князю служю, ли власть держю, ли ремество; да не наше есть дело почитанье книжное, но чернечьское”.

У першую чаргу св. Кірыла бачыў у кнігах сродак маральна-духоўнага ўдасканалення асобы. На яго думку, кнігі якраз і пісаліся дзеля чалавечага ўратавання. Менавіта яны з'яўляюцца адным з найгалоўнейшых вытокаў “сердечного разума” (дабрадзейнасці). Як чалавечае цела не можа жыць без ежы, так і яго душа павінна пастаянна сілкавацца “словесами” Свяшчэнных кніг.

Ва ўяўленні Кірылы самастойнае асэнсаванне кніжнай мудрасці — гэта досыць няпростая справа. Яе засваенне павінна быць арганізавана ўзважана, без залішняй спешкі. Чытаць трэба ўдумліва, са шчырай верай, бо толькі тады можа прыйсці належнае разуменне прачытанага. Хацеў таго асветнік ці не, але яго парады “з разуменнем” учытвацца ў змест біблейскіх кніг, закладвалі ўласна творчы пачатак, які супярэчыў тагачаснай традыцыі.

Прапаведнік перасцерагае, што побач з дасканалымі кнігамі, вышэйшай з якіх з'яўляецца Евангелле, існуюць і заганныя — “халдейскыя кощуны, еллиньския басни”, якія перашкаджаюць чалавеку стаць на праведны шлях. У сеці такіх кніг трапляюць людзі недастаткова падрыхтаваныя, у якіх розум знаходзіцца ў дрымоце, а асновы веры недастаткова трывалыя. А праведнікі з цвярозым розумам могуць чытаць і такія кнігі, з дапамогай якіх “беси привабливаючи беседуют”, бо падрыхтаваныя людзі ў стане адрозніць багамудрасць ад сатанінскай павуціны.

Як бачым, тураўскі кніжнік у сваіх поглядах не толькі дапускаў крытыцызм мыслення, але нават лічыў такі ўзровень развіцця розуму ў якасці адной з найважнейшых умоў далучэння чалавека да ісціны, да дабрачыннага жыцця. Такім чынам, Кірыла міжволі адыходзіў ад інтэнцыі ідэй сваёй эпохі, якія не дапускалі ўласнадумства. Услед за Кліментам Смаляцічам тураўскі гімнограф умацоўваў на землях бацькаўшчыны ідэю асэнсавання хрысціянскага веравучэння сродкамі логікі, чым садзейнічаў рацыяналізацыі тэалогіі.

Асноўнае прызначэнне чалавечай мудрасці, на думку святціцеля, — уратаванне душы. Адбыцца яно можа толькі пры набліжэнні да Бога, які з'яўляецца ідэалам духоўнай дасканаласці для кожнага чалавека. Творца Сусвету бясконца добрасны, беззаганны і бязгрэшны. Ён дакладна ведае шляхі, якія вядуць да дасканаласці асобы. Зведаць гэтыя шляхі можна толькі пазнаўшы сутнасць Бога. Але паводле перакананняў св. Кірылы, Усявышні бясконцы, бязмежны, бясплотны, нябачны і таму, безумоўна, непазнаваемы для чалавека. Па гэтай прычыне як ідэал ён недасягальны для людзей. У той жа час зямны чалавек можа пазнаць пэўныя якасці Бога праз асобныя яго тварэнні. І гэта дазволіць кожнаму ў пэўнай ступені наблізіцца да ідэальна-боскіх маральных каштоўнасцей. Кірыла Тураўскі ўказвае асноўны шлях такога набліжэння. Гэта спасціжэнне багамудрасці, удасканаленне ўласнага розуму і ўмацаванне веры. Асноўныя перашкоды на гэтым шляху ўзводзяцца рэаліямі зямнога жыцця, на пераадоленне якіх павінен скіроўваць сілу свайго розуму чалавек. “Прыгвожден есть ум мой земным вещем”, — засмучаецца прапаведнік.

Скіраваўшы свае веды, розум і мудрасць на маральна-духоўнае развіццё, кожны чалавек можа ўвайсці ў Нябеснае Царства, і тады грамадства наблізіцца да найбольш дасканалага яго ўладкавання. Больш таго, асветнік спрабуе пераканаць у тым, што амаральны, бездухоўны чалавек не можа быць мудрым. Вуснамі прарока Кірыла перасцерагае: “В злохытру душю не внидет премудрость”. А недасканалы розум, на думку настаўніка, гэта прамы шлях да духоўнага жабрацтва, заганнага жыцця.

Кніжнік верыць у бязмежную сілу розуму. Апавядаючы аб траістасці прыроды чалавека, ён засяроджвае ўвагу на тым, што акрамя духу і цела ёсць яшчэ разумная душа — розум. Гэта дае падставу Кірылу сцвярджаць, што “душа умородительна”. Вось чаму дзякуючы розуму чалавек можа ўзняцца да вяршынь духоўнай дасканаласці, арганізаваць жыццё ў строгай адпаведнасці з

найважнейшым маральным законам, пазбавіцца спакуслівых заганных дзеянняў і ўчынкаў. "Уздыміце крылы вашага розуму, і паляцім разам далёка ад згубнага граху", -- з паэтычнай узнёсласцю раіць асветнік, праяўляючы шчыры клопат аб унутраных цнотах супляменнікаў. Назваўшы розум крыламі маральнасці чалавека, Кірыла з аксіёматычнай упэўненасцю фармулюе важнейшую заканамернасць духоўнага ўдасканалення.

Тураўскі Златаслоў цесна звязвае чалавечую мудрасць з выкананнем асноўных пастулатаў хрысціянскай этыкі. Ён усямерна імкнецца растлумачыць людзям неабходнасць набыцця адпаведных ведаў, як абавязковай умовы на шляху іх маральна-духоўнай дасканаласці. Прапаведнік папярэджвае, што няведанне этычных патрабаванняў не толькі не можа быць апраўданнем адхілення ад іх чалавечых паводзін, а, наадварот, абцяжарвае адказнасць кожнага за ўласныя ўчынкі. "Невидения злее есть согрешения", — катэгарычна заключае святыцель. Растлумачвае ён гэта даволі проста. Людзі, якія ўсведамляюць ганебнасць сваіх паводзін, маюць магчымасць пакаяцца і не паўтараць іх у далейшым. Тыя ж, хто свае ўчынкі нават сам перад сабой апраўдвае ўласнай недасведчанасцю, не могуць прыйсці да пакаяння, і, згодна Свяшчэннага Пісання, такія грахі не даруюцца. Такім чынам, Кірыла Тураўскі пераканаўча паказвае, што грэх абавязаны неразумнасці як асноўнай крыніцы свайго з'яўлення і прыдатнай глебе для далейшага сілкавання.

У сваіх творах прапаведнік акцэнтуе таксама ўвагу на тым, што, з аднаго боку, недахоп розуму прыводзіць да заган, а з іншага — і яго развіццё ў адрыве ад веры можа спакусіць чалавека да самавольства, ганарліўства і іншых маральна-духоўных нядугаў. Розум, які грунтуецца на веры, з'яўляецца падмуркам этыка-рэлігійных ідэй святыцеля. Мірская мудрасць, па глыбокім перакананні Тураўскага, мае права на існаванне, але яна абавязкова павінна быць маральна хрысціянізавана. Крыніцай ісціны служыць Біблія, але спасцігнуць яе змаст зможа не кожны. Таму ізноў Кірыла Тураўскі падыходзіць да ўсведамлення неабходнасці растлумачвання і каментару Свяшчэннага Пісання, што засцеражэ, на яго думку, ад няправільнага разумення кніжных ісцін, а значыць, і не дазволіць развіццё розуму ў шкодным напрамку. Такім чынам, у імкненні не дапусціць распаўсюджвання іншадумства, асветнік лічыць магчымым каментар Свяшчэннага Пісання, але ж тады і ў гэтым выпадку практычна закладвае асновы крытыцызму мыслення.

Невыпадкова, што многія даследчыкі нават у творах Кірылы Тураўскага знаходзяць элементы ерасі. Як ні імкнуўся прапаведнік дакладна перадаваць сутнасць асобных палажэнняў біблейскіх кніг, ён даносіў да чытача сваё ўласнае іх бачанне, якое падчас разыходзілася з тлумачэннямі іншых багасловаў. І, як слушна заўважае А. Мельнікаў, "ерась адрозніваецца ад догмы часта амаль незаўважнымі паўтонамі, і таму іх цяжка выявіць у творах, якія не з'яўляюцца ўласна тэалагічнымі трактатамі". Тураўскі ж кніжнік у многіх сваіх творах складае цэлыя сказы з асобных, узятых з розных месц Свяшчэннага Пісання выразаў і надае ім новы адценак і крыху іншы сэнс.

Усе творы Кірылы Тураўскага прасякнуты ідэяй магчымасці маральна-духоўнага ўдасканалення кожнай асобы і грамадства ўвогуле ў зямным прамежку жыцця. Прычым ускосна на прыкладзе Ісуса Хрыста і асабліва Дзевы Марыі прапаведнік паказвае, што ў ідэале, дзякуючы дабрачыннаму жыццю, кожны можа дасягнуць нябесных вяршынь. Само ўчалавечванне Бога прапаведнік тлумачыць неабходнасцю адкрыць людзям шлях да ісціны, пазбавіць іх ад "духовного недуга". Дарэчы, менавіта з падобных зярнят і ўзрастуць у XVI ст. ідэі рэфармацыйнай плыні ў хрысціянстве.

Асветнік рабіў акцэнт на актыўна-дзейсны бок жыцця — як неабходную ўмову маральна-духоўнага станаўлення чалавека. Ён папярэджваў, што зусім недастаткова самай шчырай веры ў Бога, спавядальных малітваў і пакаянняў, каб дабіцца ўратавання душы. Думаць, што Усявышні пашле збаўленне верніку без уласных намаганняў апошняга, гэта найвялікшы падман. "Будзь слаўны не светлай вопраткай, але добрымі ўчынкамі", — дае парады Кірыла.

Добрыя справы — гэта, як нішто іншае, маральна ўзвышае чалавека. Прычым у многіх творах Кірылы Тураўскага адчуваецца заклапочанасць аб адпаведнай скіраванасці гэтых спраў. Арыентаванасць іх да бліжняга, аднаверца і нават праведніка і грэшніка, сінтэзуе асновы хрысціянскага светапогляду і ментальную скіраванасць нашых прашчураў да абшчыннасці і супольнасці. Таму вельмі часта ў сваіх малітвах пастыр моліць "о всех и за вся".

Тураўскі кніжнік падкрэслівае, што, стварыўшы чалавека, Бог даў яму свабоду волі. Дзякуючы гэтаму, кожны індывід можа сам выбраць свой шлях у жыцці, па сваім жаданні здзяйсняць любыя ўчынкі, фарміраваць уласныя паводзіны, але ж несці асабістую адказнасць за іх наступствы.

Ведаючы недасканаласць людзей, Усявышні стварыў анёлаў дзеля апекі кожнага чалавека. У адрозненне ад многіх багасловаў, якія лічылі, што анёлы-абаронцы служаць толькі веруючым, Кірыла Тураўскі пераконваў, што "душа **всякого человека** пред Бог приходит с приставленым к ней ангелом, верного же и неверного, сущаго в законе и всякого беззаконника" (выдзелена мною. — *В. Б.*). Больш таго, дзеля выпрабавання людзей, Творца Сусвету спецыяльна дапусціў, каб Сатана да кожнага чалавека паслаў анёлаў-губіцеляў, якія на кожным кроку спакушаюць і вернікаў, і грэшных да "злых" спраў. Д'ябал спрабуе ўвесці чалавека ў грэх, схіліць яго да заганных паводзін, прываблiваючы падманнымі асалодамі зямнога жыцця. Ва ўяўленні Кірылы Тураўскага ўсё гэта робіцца паводле Божага папушчэння, каб выпрабаваць духоўныя сілы кожнага.

Такім чынам, Кірыла Тураўскі ўзвышае агульначалавечую

праблематыку, злучае ў адзінае цэлае катэгорыі дасканалага, разумнага, вечнага, прыгожага, цнатлівага і сцвярджае непераходзячае значэнне маральна-духоўных каштоўнасцей. "Познающий разум" асветнік уяўляе як сапраўды свабодны розум. Але хоча, каб ён быў скіраваны не на дылему далучэння да дабра ці зла, а на свабодны выбар пэўных шляхоў, якія вядуць толькі да дабра.

У процiборстве сіл дабра і зла яшчэ выразней праяўляецца значнасць ролі кожнага чалавека ва ўласным удасканаленні і гарманізацыі грамадскіх адносін. На думку тураўскага кніжніка, імкненне да такога ўдасканалення павінна быць сфарміравана ў кожнага прадстаўніка людской супольнасці. Ён засяроджвае ўвагу на тым, што чалавек ёсць адно з найвышэйшых тварэнняў Усявышняга. А на зямлі чалавек з'яўляецца вянцом усяго, што створана Богам. Кожны індывід павінен усведамляць сваю значнасць і высокую місію ў зямным "тварным жыцці". Звяртаючыся да чалавека, Кірыла Тураўскі так вызначаў яго месца, адведзенае Богам: "Тобе всю тварь на работу створых, небо и земля тобе служита: оно влагою, а си плодомъ. Тебе ради солнце светомъ и теплотою служить, и луна с звездами нощъ обеляетъ. Тебе деля облаци дъждьмъ землю напаяють и земля всяку траву семениту и древа плодовитая на твою службу въздращаеть. Тебе ради реки рыбы носять и пустыни звери питаеть". Кірыла Тураўскі падкрэслівае, што Сусвет створаны дзеля чалавека, што ўвесь прыродны космас прызначаны служыць яму.

Кірыла Тураўскі быў перакананы, што калі б чалавек ведаў сваю сутнасць наблізіўся б да пазнання Бога, то існавала б рэальная магчымасць сапраўднай усёабдымнай чысціні ўва ўсіх праявах жыцця. Такім чынам, і ў гэтым выпадку асветнік падводзіць да ўсведамлення ведаў і адукаванасці, як падмурку маральнага ўдасканалення кожнай асобы і ўсяго грамадства наогул. Як сапраўдны педагог ён разумее важнасць дапамогі з боку адукаваных людзей тым, хто яшчэ не дасягнуў такога ўзроўню развіцця мудрасці і духоўнай дасканаласці. Больш таго, Кірыла быў перакананы ў тым, што кожны, хто дасягнуў пэўных вяршынь на шляху маральна-духоўнага ўдасканалення, проста абавязаны дзяліцца сваімі набыткамі з іншымі, садзейнічаць іх разумоваму і духоўнаму развіццю. "Тако обретый божественных книг скровище... не себе единому есть на спасение, но инем многым послушающим его", — павучаў настаўнік.

Пры гэтым айчынны Златавуст падкрэсліваў, што навучанне ўяўляе сабой надзвычай важную, але вельмі складаную справу. Выніковасць гэтай дзейнасці ў многім залежыць ад саміх навучэнцаў, кожны з якіх глыбока і свядома павінен пранікаць у сэнс кніжных тэкстаў. І як ні цяжка ўнікнуць у сэнс напісанага, яшчэ цяжэй, нават поўнасцю ўразумеўшы тэкст, даходліва растлумачыць гэта іншым. Настаўнік павінен праяўляць тактоўнасць, настойлівасць і цярплівасць. Калі вучань не зразумеў тлумачэння настаўніка з першага разу, настаўнік павінен паўтараць яго да таго часу, пакуль вучань не ўсвядоміць прапануемы матэрыял. Калі ж шматкратныя намаганні не прынясуць поспеху, то прычыну трэба шукаць у вучні: "Да се ныне мнози суесловци непокориви и по десятнем-надесят наказании не послушают, что убо будет таковым!"

Тураўскі Златаслоў і сам быў не толькі красамоўным прамоўцам, але вельмі дасканала, на высокім мастацкім узроўні пісаў шматлікія павучанні, казанні, малітвы, каноны, прытчы і іншыя творы, карысныя для душы. З педагагічнага пункту гледжання яго павучанні складзены такім чынам, што адначасова ўздзейнічаюць на свядомасць і эмоцыі чалавека, таму з'яўляюцца вельмі дзейснымі выхаваўчымі сродкамі. У невялікай уступнай частцы з адкрытым дыдактычным пафасам настаўнік абуджае цікавасць да пэўнай праблемы. У асноўнай частцы ён робіць чытача як бы ўдзельнікам падзей, вымушае яго асэнсоўваць і адчуваць сутнасць з'явы. Для ажыццяўлення такой задумы пісьменнік удала карыстаўся багаццем эпітэтаў, параўнанняў, гіпербал, метафар, сінтаксічных паралелізмаў і інш. Літаратуразнаўцы падкрэсліваюць, што па ўдалым выкарыстанні разнастайных мастацкіх прыёмаў Кірылу Тураўскаму не было роўных сярод яго сучаснікаў. У заключнай частцы павучанняў святціцель уздымаў іх танальнасць да найвышэйшай ступені святочна-ўрачыстага гучання, каб замацаваць у чытача ўзнёсла-душэўны настрой. Там жа часта ён дае кароткія маральна-педагагічныя парады, якія звернуты да сэрца чытачоў: такім чынам ствараюцца перадумовы для самаўдасканалення асобы.

Даследчыкамі падмечана, што многія свае тэксты Кірыла Тураўскі ўзбагачае традыцыямі ўсходне-славянскага народнага слова — галашэнняў, дружыннага эпасу, прытчаў і інш. Дасягненні візантыйскага красамоўства ім сінтэзуюцца з набыткамі вуснай народнай творчасці. Дзякуючы гэтаму яго творы характарызуюцца высокім мастацкім узроўнем, вобразнасцю, пранікнёнасцю.

Як высока ні ставіўся Кірыла Тураўскі да ролі мудрасці і розуму ў вызначэнні ступені дасканаласці асобы, усё ж пры пабудове іерархічнай лесвіцы маральна-духоўных каштоўнасцей ён строга прытрымліваўся асноўных палажэнняў хрысціянскай этыкі. Перасцерагаючы, што адна толькі мудрасць без падмацавання іншымі якасцямі можа прывесці і да заган, ён на першае месца вылучаў ціхмянства. "Луче есть искати кротости, нежели мудрости", — павучаў прапаведнік біблейскімі пастулатамі. У трактоўцы Кірылы Тураўскага "кротость" — як вынік пакаяння ўключае ў сябе цярплівасць, разважлівасць, памяркоўнасць, незлаблівасць і іншыя маральныя якасці. Не столькі ў духу самапрыніжэння асобы, а найперш дзеля супрацьпастаўлення ганарлівству, фанабэрыі, пыхлівасці, ён у многіх сваіх творах ухваляе ціхмянасць як асноўны з сямі дароў благадаці. Сімвалічна, што святціцель як бы папярэджвае аб правільным разуменні зместу гэтай якасці, таму

акцэнтуе ўвагу на "добрай кротости". У яго разуменні менавіта "кротость добрая еже есть всему добру мати".

Ціхмянства ў разуменні Кірылы Тураўскага грунтуецца на пакаянні, але ў ім адсутнічае дух безнадзейнасці і роспачы. Як і наогул усе творы асветніка, гэтая якасць напоўнена хрысціянскім аптымізмам. Спадзяванне прапаведнік адносіў да асноўных станоўчых маральна-духоўных якасцей. Яно не павінна пакідаць чалавека ні ў якіх сітуацыях. І ў гэтым жыццясцвярджальная сіла вучэння Златавуста.

Згодна з хрысціянскай пабудовай этычнага акіялагічнага раду, Кірыла Тураўскі лічыў, што найважнейшай маральнай якасцю, якая, як ніякія іншыя, садзейнічае гарманізацыі грамадскага ўладкавання, з'яўляецца любоў. Менавіта гэтая якасць узвышае чалавека над іншымі "тварнымі" істотамі і ачышчае душу кожнага. Важнейшай праявай любові з'яўляецца міласэрнасць. Набыццё гэтых якасцей дапаможа чалавеку ўзняцца да вяршынь дабрачыннасці і духоўнай дасканаласці. "Мир же и любовь, межи собою имейте, — павучаў вялікі асветнік, — се бо глава добродетели".

Значнае месца ў творах Кірылы Тураўскага займае выкрыццё адмоўных маральных якасцей. Іх пераадоленні не толькі ачышчалі душу, але і гартавалі дух чалавека. Адной з найгоршых маральных заган свяціцель лічыў ганарліўства. Абапіраючыся на асноўныя пастулаты хрысціянскай этыкі, Тураўскі-кніжнік пераконваў, што ганарліўства з'яўляецца надзвычай прыдатнай глебай для развіцця духоўных недамаганняў, якія ў сваю чаргу даюць пачатак і цялесным хваробам чалавека. Такім чынам, чалавек адначасова слабее душой і целам. Непасрэдна з ганарліўства развіваюцца "непокоренье", "прекословье", "тщеславие", "кичение", "немилосердие" і іншае зло. Кірыла Тураўскі не заўсёды прытрымліваецца аксіялагічнай паслядоўнасці хрысціянства і ў якасці найцяжэйшых людскіх заган называе роспач, ляноту, пралюбадзейства, гнеў, абжорства, зайздрасць і сквапнасць. Апусташаюць душу і вядуць да грахападзення "зломыслье", "клевета", "гнев", "вражда", "разбой", "пьянство" і іншыя. Сімвалічна, што пераадоленне падобных духоўных захворванняў патрабуе ад чалавека значных намаганняў, і нават само ўхіленне ад іх Кірыла Тураўскі называе подзвігам і заклікае ўсіх да яго здзяйснення.

Чалавек жа, які валодае станоўчымі маральнымі якасцямі, накіроўвае іх на добрыя ўчынкі, якія аб'ядноўваюцца ў прыстойныя паводзіны, што вядуць да дабрачыннага жыцця. Усё гэта вялікі асветнік аб'ядноўваў у паняцце служэнне Богу, у чым бачыў сэнс існавання і прызначэння чалавека.